**Нікіпорчык А.Д. (Гродна)**

## Паэма Максіма Багдановіча «Страцім-лебедзь»: праблема духоўна-мастацкага зместу

Творчасць М. Багдановіча заўсёды прыцягвала да сябе ўвагу даследчыкаў беларускай літаратуры. Нельга не пагадзіцца з Р. Бярозкіным, што «ні адзін беларускі паэт не прынёс крытыцы столькі клопату, колькі Максім Багдановіч» [2, с. 31]. Для вульгарных сацыёлагаў 1920-х гг. ён быў «бардам нацыяналізму, ідэолагам беларускай буржуазіі, прадстаўніком упадніцкага мастацтва» [цыт. па: 2, с. 31–32]. У першыя пасляваенныя гады яго, наадварот, пачалі залічваць да паэтаў-«рэвалюцыянераў». Спробы бачыць некаторыя творы М. Багдановіча больш рэвалюцыйнымі, чым яны ёсць на самой справе рабіліся і ў пазнейшы час. Так, многія даследчыкі (Р. Бярозкін, М. Грынчык, А. Лойка і інш.) указвалі на рэвалюцыйны пафас невялікай паэмы «Страцім-лебедзь» і з гэтых пазіцый падыходзілі да яе аналізу. Аднак аўтар не ставіў сабе за мэту адлюстраваць рэвалюцыйныя грамадскія настроі і падзеі. «Я задумаў твор на тэму білейскага міфа. Гэтую тэму навеяла мне вайна, гібель мільёнаў і мой уласны лёс» [цыт. па: 1, с. 666], – прызнаваўся М. Багдановіч Зм. Бядулю.

Твор датуецца 1916-м годам – «часінай суворай», калі ішла імперыялістычная вайна, якая па маштабу катастрофы блізкая да біблейскага патопу, абрынутага на людзей за іх грахі: «Не анёл у трубу уструбіў – / З хмары бог старому Ною гаварыў: / “Поўна з краем чаша гневу майго / На людскія грахі ды бясчыннасці. / Вось надойдзе часіна суворая. / Лінуць з неба залівы бязмерныя / І абмыюць ад бруду смуроднага / Ўсю зямлю яны, белы-вольны свет”» [1, с. 316].

Біблейскі міф і фальклорны вобраз лебедзя ў паэме значна перапрацоўваюцца. Напрыклад, у народным сказе дабрыня і самаахвярнасць Страціма пасіўныя і нязмушаныя, у паэме ж яны паўстаюць як яго свядомы выбар. Як падкрэслівае М. Грынчык, у вобразе птаха раскрываецца эстэтычны ідэал М. Багдановіча: «гераічная асоба, <...> здольная на самаахвярную барацьбу і подзвіг у імя дабра і шчасця ўсіх людзей» [3, с. 194]. Страцім загінуў не таму, што быў занадта добры, а таму, што яго мужнасць і імкненне да свабоды не абудзілі пачуцця суперажывання ў птахаў дробных. Яны не адгукнуліся на просьбу стомленай і знясіленай пад іх цяжарам птушкі: «“Вы ўзляціце хоць на час які / Выбіваюся з астатніх сіл <...>” / Не паслухалі птахі лебедзя. / Пацямнела у яго ў вачах, / Крыллі ўрэшце надламаліся, / Галава ў ваду апусцілася. / І пайшоў на дно мора сіняга / Страцім-лебедзь – моцны, горды птах» [1, с. 317]. М. Багдановіч не ўслаўляе Страціма-лебедзя, а шкадуе яго. Ён атаясамлівае свой лёс з лёсам гераічна-ахвярнай птушкі і нібы «прарочыць» сабе будучыню: «Ад усіх цяпер патомкі ёсць / Ды няма адных – Страцімавых».

Паэт-інтраверт, М. Багдановіч большую ўвагу надаваў уласнаму самавыяўленню, чым пераасэнсаванню складаных перыпетый знешняга свету, у тым ліку – і рэвалюцыйных. У творы «Страцім-лебедзь» напоўніцу раскрываецца інтравертная скіраванасць таленту паэта, увасабляецца так званы «інтравертны пункт гледжання» (К. Юнг), калі галоўным выступае эмацыянальнае перажыванне, а не тая з’ява рэчаіснасці, што яго выклікала. Рэальныя падзеі – імперыялістычная вайна і смерць многіх людзей – сталі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

эмацыйным імпульсам для перадачы глыбокіх унутраных перажыванняў цяжка хворага, адзінокага паэта.

Такім чынам, у паэме «Страцім-лебедзь» занатавана «аўтабіяграфія» душы М. Багдановіча, выяўлена яго прадчуванне ўласнай планіды.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т / М. Багдановіч. – 2-е выд. – Мінск, 2001. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды.
2. Бярозкін, Р. Чалавек напрадвесні: расказ пра Максіма Багдановіча / Р. Бярозкін. – Мінск, 1986.
3. Грынчык, М. Максім Багдановіч і народная паэзія / М. Грынчык. – Мінск, 1963.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ